*Л.Н. **Нехорошева**, д-р экон. наук, профессор,*
*зав. кафедрой экономики промышленных предприятий БГЭУ*

# ГІСТОРЫЯ РАЗВІЦЦЯ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДВАННЯЎ У ГАЛІНЕ ЭКАНОМІКІ ПРАМЫСЛОВАСЦІ І МЕСЦА КАФЕДРЫ ЭКАНОМІКІ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ІНСТЫТУТА НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ ІМЯ В.У. КУЙБЫШАВА (ЭКАНОМІКІ ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БДЭУ)[1]

Эканоміка прамысловасці як навука актыўна стала развівацца на Беларусі ў XX ст. З 1920 г. пытаннямі эканомікі прамысловасці займаліся ў Дзяржплане БССР і на эканамічным аддзяленні факультэта грамадскіх навук БДУ, з 1922 г. — у Інстытуце беларускай культуры. Беларускія эканамісты ў 2-й і 3-й пяцігодках распрацоўвалі пераважна метадалагічныя асновы і методыку фарміравання новых галін прамысловасці, праблемы рацыянальнага спалучэння экстэнсіўнага і інтэнсіўнага тыпаў расшыранага ўзнаўлення праз удасканаленне структуры вытворчасці.

Пасля Айчыннай вайны навуковая дзейнасць беларускіх эканамістаў сканцэнтравана на праблемах рэалізацыі дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, павышэння эфектыўнасці вытворчасці. У Інстытуце эканомікі АН БССР даследавалася структура народнай гаспадаркі БССР, распрацоўваліся рэкамендацыі па яе развіцці і размяшчэнні (С.М. Малінін, І. М. Качура, І.Ц. Чарняўскі і інш.), выдадзены працы па эканамічнай геаграфіі БССР (Ф.С. Марцінкевіч, І.Ц. Чарняўскі, Я.Я. Собалеў, 1953–1955; і інш.). Да 1957 г. даследаваліся пытанні эканомікі асноўных галін народнай гаспадаркі рэспублікі (кіраўнікі — Г.Ц. Кавалеўскі і Ф.С. Марцінкевіч), эфектыўнасць капітальных укладанняў і новай тэхнікі ў прамысловасці (кіраўнік — М.І. Вядута). У 1964 г. у Інстытуце эканомікі АН БССР (А.М. Пашкевіч, В.І. Клецкі, С.А. Ходас, В.А. Мухіна і інш.) і Беларускім інстытуце народнай гаспадаркі (М.І. Ткачук, Л.А. Рубанаў і інш.) вывучаліся рэзервы росту прадукцыйнасці працы ў прамысловасці, праблемы ўмацавання фінансаў прамысловых прадпрыемстваў і гаспадарчага разліку. У 1961—1965 гг. вяліся даследаванні па ўдасканаленні вытворчасці ў асобных галінах прамысловасці: ліцейнай (кіраўнік — Я.А. Годзьбін), тарфяной (А.А. Жураўкоў, Б.Дз. Парэмскі, В.І. Клецкі і інш.), электраэнергетыцы (А.П. Янчанка, І.В. Левін, Р.Б. Пякеліс), выкарыстання драўніны (Г.А. Гінзбург, Б.І. Дзячкоў, Т.А. Мярэцкая і інш.). У 1960-я гг. у Інстытуце эканомікі АН БССР вывучаліся праблемы асноўных фондаў і капітальных укладанняў у прамысловасць, асноўных фондаў прамысловасці ва ўмовах гаспадарчай рэформы (А.С. Сітнікаў, В.А. Мухіна,

[1] Па матэрыялах Беларускай нацыянальнай энцыклапедыі: Т. 18, кн. II. С. 478. Л.М. Нехарошава. Эканоміка прамысловасці.

наў, В.Ц. Габелка, І.А. Міхайлава, І.Р. Філатаў), эканоміка асваення новай прадукцыі (Ф.А. Дронаў, М.М. Шатохіна, Т.С. Карачун, Э.В. Кастромічава і інш.), эканамічныя праблемы якасці машын (М.С. Куняўскі, Г.В. Грэк і інш.).

У сувязі з падрыхтоўкай у краіне гаспадарчай рэформы і пераходам прадпрыемстваў на новыя ўмовы планавання і эканамічнага стымулявання вывучаліся паказчыкі і крытэрыі ацэнкі дзейнасці прадпрыемстваў, метады іх колькаснага выражэння, паляпшэння сістэмы эканамічнага стымулявання працоўных калектываў і асобных работнікаў (Г.Ц. Кавалеўскі, Э.Л. Лутохіна, Я.І. Ландзін, А.М. Пашкевіч, В.І. Клецкі, Г.А. Рысіна, С.М. Малінін, В.Ф. Рамашкін, В.І. Выбарнаў, В.С. Маўрышчаў, А.Г. Заўялкаў, П.М. Кацура, Т.С. Карачун, З.А. Анцюфрыева, А.І. Ясінскі, А.Р. Гарадзецкі і інш.). Распрацавана і ўкаранёна ў аўтамабільную і іншыя галіны прамысловасці методыка аналізу выкарыстання вытворчых фондаў (М.М. Гарбачэўскі, Ф.А. Дронаў, П.М. Кацура, Б.Б. Крупянкоў).

У 1970-я гг. паглыбляюцца даследаванні эканамічных праблем навукова-тэхнічнага прагрэсу ў прамысловасці, удасканалення сістэм яго планавання і эканамічнага стымулявання. Інстытутам эканомікі АН БССР разам з НДІ эканомікі і эканоміка-матэматычных метадаў планавання пры Дзяржплане БССР, іншымі навукова-даследчымі ўстановамі, галіновымі міністэрствамі і ведамствамі распрацаваны “Даклад-прагноз па найважнейшых сацыяльна-эканамічных і навукова-тэхнічных праблемах развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1976–1990 гг.”. З 1973 г. беларускія эканамісты займаюцца таксама праблемай павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці на аснове інтэнсіфікацыі (метадалогія, методыка, фактары). Даследуюцца праблемы эканомікі сацыялістычнай прамысловасці (В.С. Маўрышчаў, К.І. Невельская і інш.), эфектыўнасць прамысловай вытворчасці (В.І. Выбарнаў, В.С. Маўрышчаў), фонды вытворчага накаплення (Ф.В. Баравік, М.А. Плашчынскі), арганізацыі асноўнай і дапаможнай вытворчасці, эканоміка выкарыстання аўтаматычнага абсталявання і аўтаматычных ліній, фактар часу і эфектыўнасць капітальных укладанняў (кіраўнікі С.М. Гальдштэйн і М.С. Сачко), эканоміка лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці (кіраўнік А.Д. Янушка). Пытанні эканомікі адпаведных галін вывучаюцца ў Віцебскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці, Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце, Магілёўскім тэхналагічным інстытуце харчовай прамысловасці. Галіновыя аспекты эканомікі прамысловасці распрацоўваюцца таксама эканамічнымі падраздзяленнямі міністэрстваў і прадпрыемстваў.